Поэтому можно утверждать, что педагогические основы использования укрупнения задач в современном образовательном процессе правомерно является тем средством обучения, без применения которого невозможно активное и прочное усвоение учащимися программного материала, их всестороннее воспитание и развитие, приобщение к труду творческого характера.

Список литературы
1. Эрдниев П.М., Эрдниев Б.П. Укрупнение дидактических единиц в обучении математике: Кн. для учит. – М.: Просвещение, 1986.-255 с.

## *Филологические науки*

# РОДНАЯ МОВА ЯК СРОДАК ВЫХАВАННЯ АСОБЫ ВУЧНЯ (ГРАМАДЗЯНСКА-ПАТРЫЯТЫЧНЫ АСПЕКТ)

*В.М. Карчагіна*
*Віцебск, ВДУ імя П.М Машэрава*

Беларусь з'яўляецца адной з нямногіх краін на постсавецкай прасторы, дзе дакладна сфармулявана і актыўна праводзіцца дзяржаўная маладзёжная палітыка. Абарона інтарэсаў моладзі – адзін з прыярытэтаў прэзідэнцкага курсу. Асаблівую ўвагу дзяржава звяртае на грамадзянска-патрыятычнае выхаванне моладзі. “Кампетэнтнасць, ініцыятыўнасць, самастойнасць і, галоўнае, сацыяльная адказнасць за будучыню краіны – менавіта гэтыя якасці трэба фарміраваць у маладых грамадзян” [1]. Сацыяльнай патрэбай і тлумачыцца актуальнасць дадзенай тэмы.

Мэта артыкула – вызначыць ролю роднай мовы ў фарміраванні асобы вучня, грамадзяніна РБ.

**Матэрыял і метады.** Да аналізу прыцягнуты падручнікі па беларускай мове і літаратуры для 9[га] класа. Выкарыстаны агульнанавуковыя метады тэарэтычнага даследавання. Для выдзялення асобных прыкмет, уласцівасцей аб'екта доследу быў прыменены метад аналізу. З мэтай семантычнага спалучэння, сістэматызацыі розных бакоў аналізуемай з'явы выкарыстан метад сінтэзу. У аснове меркаванняў пра падабенства і розніцу даследаваных падыходаў пакладзены метад параўнання. Для выдзялення і фіксацыі адносна ўстойлівых якасцей аб'ектаў і іх адносінаў, вызначэння асноўных накірункаў, у межах якіх разглядаецца аналізуемая з'ява, выкарыстан метад абагульнення. У аснову вывадаў пакладзены метад індукцыі.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Моўнае развіццё асобы непасрэдна звязана з фарміраваннем духоўнага вобліку, што вызначаецца роляй мовы ў жыцці грамадства. Выдатны вучоны XIX ст. Ф.І.Буслаеў пісаў: “Родная мова так зраслася з асобай кожнага, што вучыць мове – значыць разам і развіваць духоўныя здольнасці вучняў” [2].

З'яўляючыся асноўнай часткай духоўнай культуры, этнічнай прыметай нацыі, мова лічыцца адным з галоўных сродкаў ідэнтыфікацыі асобы чалавека, выхавання нацыянальнай самасвядомасці, далучэння да сусветнай культуры. Менавіта таму гэты важны сацыяльны аспект пакладзены ў аснову Закона “Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь”: ”Мова – не толькі сродак зносін, а і душа народа, аснова і важнейшая частка яго культуры”.

Але справа ў тым, што родная мова – не толькі сродак узаемін паміж людзьмі. Гэта “адзежа душы народа” (Ф.Багушэвіч), сфера тонкіх адчуванняў душы, бурлівых эмоцый і голас спрадвечнага духу. Яна аснова. Яна жывая, гэтая сфера, пакуль жывая родная мова.

Любая літаратура – з'ява нацыянальная. Так, беларускія пісьменнікі выяўлялі, і выяўляюць думкі, пачуцці, псіхалогію беларусаў, і робяць гэта вобразнымі сродкамі беларускай мовы. Мова – матэрыял і інструмент кожнага пісьменніка. Мова – найбольш важная нацыянальная прыкмета літаратуры. Менавіта па мове звычайна і адрозніваюць асобныя нацыянальныя літаратуры.

У 9-м класе пачынаюць вывучаць літаратуру з яе самай старажытнай формы – ананімнай, вуснай, г.зн. міфалогіі, фальклору. Знаёмяцца з асноўнымі дасягненнямі прыгожага пісьменства Антычнасці. Потым знаёмства з Бібліяй, найвялікшым здабыткам культуры чалавецтва; з некаторымі літаратурнымі творамі перыяду ўваходжання сучасных беларускіх земель у

Репозиторий ВГУ

Старажытную (Кіеўскую) Русь (“Жыццё Еўфрасінні Полацкай”, словы, казанні і павучанні Кірылы Тураўскага). Эпоху Сярэднявечча зменіць эпоха Адраджэння (Рэнесансу). Знаёмства з творчасцю Ф.Скарыны і М.Гусоўскага, С.Буднага і В.Цяпінскага. Беларускую літаратуру Новага часу, што пачалася напрыканцы XVIII – пачатку XIX ст. і працягваецца па сённяшні дзень, вывучаюць, пачынаючы з паэм “Энеіда навыварат” і “Тарас на Парнасе”. Дзевяцікласнікі вывучаюць творчасць беларуска-польскіх аўтараў Я.Чачота, У.Сыракомлі, Я.Баршчэўскага, беларускіх пісьменнікаў В.Дуніна-Марцінкевіча, К.Каліноўскага, Я.Лучыны, Ф.Багушэвіча. У XX стагоддзі беларуская літаратура дасягнула асаблівага росквіту. У 9-м класе вывучаюць творчасць такіх яе вяршынных постацей, як Я.Купала,Я.Колас,Цётка,М.Багдановіч,А.Гарун. Гэта асноўныя гістарычныя эпохі, праз якія прайшлі як беларуская, так і руская, і большасць еўрапейскіх літаратур. Гэта наша спадчына, што робіць беларуса беларусам. Знаёмства з лепшымі творамі айчынных пісьменнікаў у іх храналагічнай паслядоўнасці дапамогуць настаўніку сфарміраваць належныя эстэтычныя і грамадскія ідэалы, стаць сапраўднымі грамадзянамі, патрыётамі сваёй Бацькаўшчыны.

**Беларуская мова.**У падручніку па мове 234 практыкаванні, з іх тэкставых – 47. Астатнія ўяўляюць сабой асобныя сказы. Прааналізаваўшы тэкставыя практыкаванні, мы склалі табліцу:

| | |
|---|---|
| 1. Грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне | 13 практ. – 28% |
| 2. Ідэалагічнае выхаванне | 4 практ. – 8,5% |
| 3. Маральнае выхаванне | 5 практ. – 10,6% |
| 4. Эстэтычнае выхаванне | 6 практ. – 12,8% |
| 5. Культура самапазнання,самарэгуляцыі асобы | 7 практ. – 14,9% |
| 6. Культура здаровага вобразу жыцця | 2 практ. – 4,25% |
| 7. Працоўнае і прафесійнае выхаванне | 4 практ. – 8,5% |
| 8. Экалагічнае выхаванне | 3 практ. – 6,4% |
| 9. Культура быту і адпачынку | 3 практ. – 6,4% |

Як бачна, у падручніку прадстаўлены матэрыял, які садзейнічае ўсебаковаму развіццю асобы вучня. Ёсць матэрыял на ўсе накірункі выхавання, але перавага аддаецца грамадзянска-патрыятычнаму.

**Заключэнне.** Усведамленне таго, што любоў да мовы ёсць адно з праяўленняў любові да Радзімы, вызначае ўсю патрыятычную дзейнасць настаўнікаў-моваведаў.

У рашэнні тых задач, якія сёння стаяць перад школай, важнае месца належыць роднай літаратуры і мове як вучэбным прадметам.

Змест праграмных твораў можа забяспечыць паспяховае дасягненне адной з важнейшых мэт адукацыі, вызначанай законам “Аб адукацыі ў РБ”, - спрыянню гарманічнаму развіццю асобы, поўнай рэалізацыі яе творчых здольнасцей.

Вывучэнне мовы і літаратуры і выхаванне мовай і літаратурай – з’явы ўзаемазвязаныя і ўзаемазалежныя.

Усё залежыць ад чалавека, яго вытокаў, ад маральнага падмурка, на якім грунтуецца ўсё чалавечае. З нічога нішто і будзе.

Вядома, што чалавек у жыцці становіцца такім, якім выйшаў з дзяцінства. Дзяцінства, сагрэтае клопатам дзяржавы, садзейнічае выханню свабоды духу, уздымае нацыянальную самасвядомасць. Нам, грамадзянам Рэспублікі Беларусь, нельга перарываць кола гістарычнага развіцця. “Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі”, - засцерагаў Ф.Багушэвіч.

І мы ўпэўнены: гісторыя нашай краіны, жыццё нашых бацькоў, веды, набытыя ў школе, не дазволяць вучню сысці са шляху чалавека-грамадзяніна, чалавека-патрыёта. Галоўнае, каб кожны вучань адчуў сябе адказным грамадзянінам краіны, прадстаўніком «пакалення Незалежнасці[1]”, які можа (і абавязан!) унесці свой уклад у стварэнне шчаслівай будучыні суверэннай, незалежнай Рэспублікі Беларусь.

Спіс літаратуры

1. З выступлення Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Г. Лукашэнкі на 42-м з’ездзе Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі 20 студзеня 2015 г.
2. Сучасная беларуская мова: вучэб. дапам. / Л.М.Грыгор'ева [і інш].; пад агул. рэд. Л.М.Грыгор'евай. – 3-е выд., выпр. Мінск: Вышэйшая школа, 2010. – С. 62–73.

Репозиторий ВГУ